УДК 37.091.31:001.895

Т. У. Жукоўская, выкладчык

# ПРАЕКТ ЯК АДНА З ІНАВАЦЫЙНЫХ ФОРМ АРГАНІЗАЦЫІ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ

One of the generally recognized educational goals in domestic pedagogy is the development of rational and critical thinking. In organization of educational process its importance attributes to formation of intellectual skills and cognitive search. Project method helps to solve a range of tasks of personality-oriented pedagogy. In this article we illustrate one of the innovative forms of critical thinking development on practical examples – a project that reflects the implementation of personal creative students' abilities in the process of search and research activity.

**Уводзіны.** Сёння, калі інтэнсіўна расце ўдзельная вага творчай, даследчай, самастойнай працы студэнтаў, важным накірункам развіцця сістэмы адукацыі з'яўляецца распрацоўка новых канцэптуальных інавацый, якія адрозніваюцца арыгінальнасцю, свежай ідэяй, нешаблонным і больш эфектыўным спосабам рашэння той ці іншай педагагічнай задачы.

Праектаванне – гэта адзін з відаў інавацыйнай дзейнасці, які развівае актыўнасць як студэнтаў, так і педагогаў. Слова «праект» запазычана з лацінскай мовы, яно паходзіць ад слова «proektus», што абазначае літаральна «выкінуты наперад». У сучасным тлумачэнні праект – гэта намер, які ажыццявіцца ў будучым; гэта форма праяўлення творчасці, арыгінальнасці інтэлекту, новых ідэй.

**Асноўная частка.** Праект як адна з інавацыйных форм арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу прымяняецца апошнім часам вельмі часта ў педагагічнай практыцы. А. І. Кочатаў разглядае яго як пэўную сістэму поглядаў пры мадэляванні нейкага працэсу ці з'явы, пры фармуляванні той або іншай задумкі педагога або калектыву. Асноўнай мэтай праектнай дзейнасці з'яўляецца фарміраванне творчага мыслення студэнтаў, бо менавіта творчыя, актыўныя людзі, здольныя да самарэалізацыі, запатрабаваныя ва ўсіх сферах нашага жыцця. Праектны метад дапамагае ў вырашэнні шэрагу задач асобасна-арыентаванай педагогікі: развівае пазнавальны інтарэс студэнтаў, уменне самім канструяваць свае веды, арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы, аналізаваць атрыманую інфармацыю, самім прапаноўваць гіпотэзы, прымаць рашэнні.

Метад праекта дазваляе будаваць навучанне і выхаванне на актыўнай аснове праз мэтанакіраваную дзейнасць студэнта, арыентуючыся на яго асабісты інтарэс і практычную запатрабаванасць атрыманых ведаў. Дадзены метад прадугледжвае наяўнасць значымай для студэнта, выкладчыка праблемы, пошук шляхоў рашэння, практычнае ўвасабленне атрыманых вынікаў у працэсе дзейнасці.

Праект можа выконвацца індывідуальна, але часцей і эфектыўней – у калектыве. Важным момантам з'яўляецца падвядзенне студэнтаў да самастойнай фармулёўкі праблемы і гіпотэзы яе рашэння. Выкладчык можа падказаць крыніцы інфармацыі або даць напраўленне для самастойнага пошуку. У выніку сумесных намаганняў студэнты павінны разгледзець праблему і пастарацца яе рашыць з дапамогай ведаў з розных галін.

Практыка паказвае, што галоўныя цяжкасці выклікае фармулёўка праблемы. Праблема часта падмяняецца тэмай абмеркавання, а гэта не адно і тое ж, так як праблема заўсёды будуецца на супярэчнасці і патрабуе некалькіх варыянтаў рашэння.

Прапануем асноўныя *патрабаванні* да выкарыстання метаду праекта ў вучэбна-выхаваўчым працэсе: наяўнасць у творчым вучэбным ці выхаваўчым плане праблемы, якая патрабуе інтэграваных ведаў, мерапрыемстваў; практычная, тэарэтычная, пазнавальная значнасць атрыманых вынікаў; самастойная (індывідуальная, калектыўная) дзейнасць студэнтаў, выкладчыкаў; структураванне зместавай часткі праекта, г. зн. падзел праекта на этапы і размеркаванне абавязкаў паміж выканаўцамі; выкарыстанне даследчых метадаў («мазгавы штурм», «круглы стол»), якія прадугледжваюць вызначэнне праблемы; прапанова гіпотэз рашэння пастаўленых задач; абмеркаванне варыянтаў афармлення канчатковых вынікаў (прэзентацыя, відэакліп, даклад і інш.).

Праекты могуць быць некалькіх відаў: даследчыя (напрыклад, этнаграфічныя, анамастычныя, гісторыка-культурныя, радаводы і інш.); творчыя (напрыклад, «Беларуска эстрадная песня ў ацэнцы сучаснікаў», «У. Мулявін – сын зямлі адзінай»); інфармацыйныя; прыкладныя.

У рэальнай практыцы часцей за ўсё сустракаюцца змешаныя тыпы праектаў, якія называюць творчымі праектамі.

Праз праектную дзейнасць можна дасягнуць наступных мэт: развіць мысленне і логіку выкладання сваіх думак; сфарміраваць навыкі пошукавай навукова-даследчай працы; выхаваць адказнасць за выкананне пастаўленай задачы пры складанні праекта; прывіць навыкі вядзення дыскусіі, уменне аргументавана, карэктна адстойваць свой пункт гледжання; атрымаць канкрэтныя творчыя вынікі; праявіць

уласную крэатыўнасць; развіць навыкі публічнага выступлення; выхаваць адказнасць за вынік індывідуальнай і калектыўнай працы.

Пры падрыхтоўцы праекта неабходна выразна разумець сэнсавае значэнне яго частак. Прапануем кароткі слоўнік некаторых тэрмінаў.

*Ідэя* – асноўны сэнс творчага праекта, які вынікае з усёй сістэмы частак праекта. Творчы праект можа мець грамадскую, выхаваўча-пазнавальную каштоўнасць толькі ў тым выпадку, калі аўтар адкрывае для грамадства нешта новае, дае сваё разуменне, сваё бачанне і тлумачэнне пэўнай з'явы.

*Тэма* – кола грамадскіх з'яў і звязаных з імі пазнавальна-выхаваўчых пытанняў, якія аўтар кладзе ў аснову зместу праекта.

*Мэта* – тое, што імкнуцца ажыццявіць.

*Праблема* – гэта вострае грамадскае пытанне, якое аўтар ставіць і, зыходзячы са свайго светапогляду, вырашае ў творчым праекце.

*Кампазіцыя* – уся будова творчага праекта, размяшчэнне і спалучэнне асобных яго частак.

*Этап* – стадыя працэсу складання праекта.

Дасканала валодаючы методыкай складання праекта, ведамі і навыкамі, складальнік больш яскрава можа выразіць сваю аўтарскую пазіцыю. Але нягледзячы на тое, што складальнік праекта разумее змест паняццяў «тэма», «мэта», «праблема», «ідэя» і г. д., іх вызначэнне і фармулёўка ў канкрэтным кантэксце часта выклікае цяжкасці. Таму такая праца павінна рэгулярна весціся на працягу ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу. Перад выкладчыкамі востра стаіць пытанне ўдасканалення методыкі працы над складаннем праекта.

Прапануем свой алгарытм падрыхтоўкі праекта «Сям'і маёй пачатак», які быў прадстаўлены студэнцкім аб'яднаннем «Пошук» на Рэспубліканскім аглядзе-конкурсе на лепшую арганізацыю ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў вышэйшай навучальнай установе Рэспублікі Беларусь і ўзнагароджаны Міністэрствам адукацыі Дыпломам II ступені. Алгарытм рэалізуецца праз наступныя складальнікі:

*Назва праекта*: «Сям'і маёй пачатак».

*Праблема*: павышэнне ролі сям'і ў выхаванні моладзі; сацыяльныя і маральныя падыходы да павышэння ўзроўню правіл існавання сучаснай сям'і, яе роля ў пабудове грамадскай стабільнасці, у вырашэнні дэмаграфічнай праблемы.

*Аб'ект даследавання*: стан сямейных адносін у гістарычным і сучасным аспектах.

*Прадмет даследавання*: гістарычныя і музейныя дакументы-сведчанні традыцыйнай сямейнай абраднасці, запісы захавальнікаў сямейных традыцый.

*Мэта праекта*: гістарычна-культурны аналіз ролі сямейных каштоўнасцей у развіцці цывілізацыі наогул і беларускай гісторыі ў прыватнасці. Усведамленне і прыняцце студэнтамі такіх якасцей і каштоўнасцей, як павага правоў і асабістай годнасці кожнага члена сям'і, раўнапраўе, давер, адданасць, узаемадапамога і падтрымка адзін аднаго.

*Задачы праекта*: складанне культурных сямейных адносін; фарміраванне ў моладзі ўстановак здаровага ладу жыцця; падтрымка сям'і і яе ўмацаванне; павышэнне ролі сям'і і яе прэстыжу ў грамадстве; умацаванне маральных асноў сям'і; павышэнне культуры шлюбна-сямейных адносін; папярэджанне і вырашэнне праблем сямейных узаемадачыненняў; выкарыстанне творчых даследаванняў студэнтаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе; інфармаванасць студэнтаў па пытаннях, якія звязаны з фарміраваннем сям'і, унутрысямейнымі адносінамі.

*Метады даследавання*: пошук, аналіз, сістэматызацыя і абагульненне вывучанага матэрыялу шляхам анкетавання, інтэрв'юіравання, апытання, працы ў архівах.

*Інавацыйныя формы і метады ўкаранення праекта*: асобасна-арыентаваны падыход (выкарыстанне праекта пры выкладанні гуманітарных дысцыплін); рэферыраванне (падрыхтоўка тэматычных дакладаў); вучэбныя дэбаты (свабодны абмен думкамі пры падрыхтоўцы праекта); бінарная лекцыя (лекцыя праводзіцца асноўным лектарам і запрошанымі гасцямі па заяўленай тэме. Напрыклад, пры правядзенні куратарам лекцыі на тэму «Сямейная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь» былі запрошаны мнагадзетная маці і псіхолаг Жаночага інстытута «Энвіла»; відэазаняткі (выкарыстанне загадзя падрыхтаваных студэнтамі відэаматэрыялаў); партфоліо (збор пісьмовых матэрыялаў, неабходных для падрыхтоўкі праекта); прафесійна-арыентаваныя сустрэчы (тэматычныя сустрэчы з пісьменнікамі, напрыклад, «Жаночыя вобразы ў мастацкай літаратуры»); музейна-экскурсійныя заняткі па тэме «Роля жанчыны ў гісторыі Беларусі»; крытычнае мысленне (уменне дыскутаваць, выказваць уласныя думкі на падзеі жыцця, пошук альтэрнатыў); «мазгавы штурм» (выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы праекта); самастойная праца (пошук архіўных матэрыялаў, дакументаў, запісы сямейнікаў).

*Атрыманыя вынікі*: даследаваны і творча апрацаваны малавядомыя звесткі традыцыйнай сямейнай абраднасці беларусаў у некаторых рэгіёнах краіны; падрыхтаваны навукова-творчыя працы, радаводы; прадстаўлены выставачны матэрыял; студэнцкія навукова-творчыя працы прэзентаваны ў студэнцкіх вучэбных і куратарскіх групах; матэрыялы навукова-творчых прац выкарыстаны ў выступленнях валанцёрскіх груп; лепшыя навукова-творчыя даследаванні былі прадстаўлены на гарадскі, рэспубліканскі, міжнародны конкурсы. Лепшыя студэнцкія працы адзначаны дыпломамі і прэміямі.

*Сфера выкарыстання*: матэрыял праекта можа быць выкарыстаны для самастойнага вывучэння традыцый і абрадаў беларускай сям'і, а таксама пры правядзенні заняткаў па беларускай і рускай мовах, куратарскіх гадзінах, у выступленнях фальклорных гуртоў і валанцёрскіх груп, пры мадэляванні сучаснага вяселля.

*Удзельнікамі праекта* з'яўляюцца члены студэнцкага аб'яднання «Пошук», выкладчыкі.

*Этапы выканання*:

1. Вызначэнне праблем, мэт і задач праекта. Акцэнтуецца ўвага на неабходнасці падрыхтоўкі праекта для прэзентацыі яго падчас правядзення акцый «Тыдзень маці», «Тыдзень дабра». Падрыхтаваны праект будзе прадстаўлены на рэспубліканскіх і універсітэцкіх выставах, падчас правядзення конкурсаў і канферэнцый універсітэцкага, рэспубліканскага, міжнароднага ўзроўняў. Абмяркоўваюцца падыходы да творчага выканання праекта.

2. Збор матэрыялаў для навукова-творчага даследавання. Разгледжаны, прааналізаваны і сістэматызаваны прад'яўленыя студэнтамі матэрыялы, абмеркавана тэма праекта і форма яго рэалізацыі. Праведзена дыферэнцыяцыя навуковых і творчых тэм.

3. Прэзентацыя індывідуальных студэнцкіх прац у вучэбна-выхаваўчым працэсе. Студэнты прэзентуюць свае праекты, вызначаюць іх мэты і задачы, ідэалагічную накіраванасць.

4. Адбор лепшых навуковых прац для прэзентацыі іх на студэнцкіх канферэнцыях. Удзел ва універсітэцкай канферэнцыі «Гісторыя маёй сям'і – адна са старонак шматвяковай гісторыі краіны», у XV Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «От идеи – к инновации».

5. Прэзентацыя індывідуальных праектаў на 7-м семінары студэнтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь «Сям'я: шлях жыццясцвярджальнай любові».

6. Прадстаўленне лепшых навуковых прац на рэспубліканскія і міжнародныя конкурсы. На Рэспубліканскі конкурс навуковых прац студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў былі вылучаны навуковыя працы: «Асаблівасці беларускага вяселля», «Асаблівасці традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў на Гродзеншчыне», «Сямейная палітыка: гісторыя і сучаснасць», «Цяжарная жанчына ў традыцыйнай культуры беларусаў». На Міжнародны конкурс студэнцкіх навуковых прац Расійскай Федэрацыі была прадстаўлена навуковая праца «Особенности белорусской свадьбы».

7. Прэзентацыя тэматычных творчых прац пры правядзенні выстаў. Працы дэманстраваліся на універсітэцкіх выставах «Маці і Радзіма адзіныя», «Вечна жыві і квітней, Беларусь», «Да маці з любоўю», на рэспубліканскіх выставах «Выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму ў дзяцей і навучэнскай моладзі», «Маральна-прававое і сямейнае выхаванне, прафілактыка проціпраўных паводзін дзяцей і навучэнскай моладзі».

8. Апрабацыя творчых даследаванняў ва ўстановах адукацыі іншых тыпаў (школы, гімназіі, дашкольныя ўстановы). Выступленні адбыліся ў СШ № 140, СШ № 79, СШ № 19, гімназіі № 23.

9. Удзел у акцыях гарадскіх і рэспубліканскіх узроўняў: «Тыдзень маці», «Тыдзень дабра».

10. Правядзенне конкурсу радаводаў з запрашэннем сямейных дынастый.

11. Правядзенне літаратурных чытанняў, прысвечаных «Тыдню маці» (літаратурны клуб «Ветліца», вучэбныя групы).

12. Правядзенне конкурсу на лепшую дзіцячую казку (падрыхтаваны студэнтамі спецыяльнасці «Выдавецкая справа»).

У прадстаўленым праекце прыведзены прыклады, якія ілюструюць тэарэтычныя палажэнні, але кожны аўтар можа іх падаць самастойна, зыходзячы з асаблівасцей тэмы і мэты праекта. Дадзены метад дапамагае цэласна ўспрымаць праект як адну з інавацыйных форм арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, што дазваляе пры складанні яго не забыцца ні на адзін з крытэрыяў, важных пры ацэнцы працы; дэманструе ўзаемасувязь і ўзаемаабумоленасць кампанентаў праекта.

**Заключэнне.** Прааналізаваўшы праект як адзін з творчых інавацыйных метадаў педагагічнага працэсу, адзначым, што ён уключае ў сябе апісанне прапануемай тэхналогіі навучання і выхавання моладзі, якая прэзентуе асноўную ідэю і канструктыўны прынцып яе рэалізацыі. Стварэнне праекта падпарадкоўваецца пошуку інавацыйных падыходаў, тэарэтычнаму абгрунтаванню і рэалізацыі аптымальнай мадэлі вырашэння пастаўленых задач. Відавочна, што дадзеная форма арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу паказвае несумненную мэтазгоднасць яе выкарыстання, што садзейнічае развіццю творчай, тэарэтычна і практычна граматнай асобы, якая валодае ўменнем лагічна абгрунтаваць і давесці да паспяховага выніку задуманае.